Наста КУДАСАВА

ПААБАПАЛ РАЗЛУКІ



Наста Кудасава нарадзілася 25 мая 1984 года ў Рагачове. Ёй падабаюцца свет, рэлігіі, мовы і тое, што ўсе людзі розныя. Аўтар кніг вершаў «Лісце маіх рук» і «Рыбы». Творы перакладаліся на рускую і балгарскую мовы.

* * *

у калысцы пляча сплыла
і забыла пра бераг.
зор, як вечнасці, — дазяла
ветах жменяй адмераў.
зорны тук — дармавая сыць
галадранцам самоты,
толькі б не перасталі плыць
плеч хупавыя флоты...

ПЛЯЧО

Плячом палячы, прытулі аж датуль,
пакуль не пачнецца віна,
прадыхай ратункам у скронь-слепату мне,
што я не адна, не адна.
хай збудзецца ўсё, што так страшна назваць,
што цепліцца ў гронках-руках,
пакуль я сплываю ў пляча твайго завадзь—
шчаслівы пакорлівы птах...

ПОЛАЯ

полымем поле выжата,
болем — выжыта.
горыч-камяк піжмавы,
віны вы ж мае!
быў жа ўраджай споведзяў,
вырай сподніх дзён...
выпаленая полымем,
іду — полая.

ЛІПАВЫ

адскавытала, і струны асіплі,
і на ўвесь выдых — падранак песенны.

помняцца толькі пяшчота і ліпень,
іншае намертва болем знесена.
быццам ні крыўдаў, ні жалю, а так...
нейкая блазанка ў горле ўсхліпвае...
лета прыйшло — шарлатан-мастак! —
з водарам нашага шчасця — ліпавым.

АДЛЕГЛАСЦЬ

расстояние — козыр прыстойных.
застылая постаць асолі на беразе
іншасвету.

расстояние — гэта стаяць паабапал
разлукі,
расстаўленымі расставаннем
на месцы сваіх адзінотаў.

а што мне рабіць з нашай адлегласцю?

кіламетры пустых узмакрэлых прасцінаў
і мы —
так адлеглыя адно ад аднаго,
на такую цябененамацвальную далечыню,
бы адкладзеныя лёсам
на потым.

ДАЛЬ

даль расцягваецца ў дай
з кожным кіламетрам жылаў,
памяць цела — злая здань,
карніца
тым, што любілі,
верніца шчымлівых дзён,
катавальных ранкаў служка,
успамінавым рыззём
набіваецца ў падушку...

* * *

узняцца на гару пляча
і ў барадзе тваёй заблытацца,
схаваць увесь зямны адчай
у непрамоўленае «злітуйся»,
каб разгадаць, што толькі тут,
табе прыліплая да шыі,
я разумею свет як цуд
і спасцігаю ўсе вяршыні.

ВЫБАР

ад бязмор'я гэта змора,
зрывы сухажыццяў,
ночы шчэрацца бяззора
вусцішнымі жрыцамі,
нас павыкідаў на бераг —
сумнавокіх рыбаў —
непасільны, непамерны
чалавечы выбар.

ПАТОП

боль, памножаны на ноль,
не зраўняецца ні з чым.
быў бы ў сэрцы дзейсны ной —
і той
не здолеў бы ўцячы.
хай жа не жыве ніхто:
ні сініца, ні асёл.
будзь, бязлітасны патоп!
нішчы маё ўсё!

* * *

Рысі ў сініх лясах асінавых.
А. СЫС

Рысі ў сініх лясах асінавых
пазіраюць вачыма дзікімі.
Еду я чалавекаспынам,
і нікому не Эўрыдыка,

толькі лес мне ў Арфеі просіцца,
клён далонькмі ільне ўкаханымі.
Дрэваверніца, сцежканосіца —
расшпіліла наросхрыст раны,

вецер дзьме ў мой адчай нялечаны,
кліча жыць на прасторы любыя…
І сядаюць шчыглы на плечы мне,
і ўсміхаюцца на ўсе дзюбы.

ЯГАДНАЯ МОЎЧ

журавінавы ваўчыцын
верш табе дашлю,
хай табе ў чужыне сніцца
пушчаў нашых шлюб.
хай ад роспачы ратуе
ягадная моўч,
помні пра мяне лясную
і дадому кроч...

КАРОЛЬ

каб віхуры ды залевы
нас не гналі ў спіну,
стала б табе каралевай,
нарадзіла б сына.

каб даверыў маім ласкам
ты сваё бяссонне,
я б табе, бы ясну краску,
вырасціла доню.

хай гады гараць, як трэскі, —
я цябе, мой дайны,
абняла б па-каралеўску
ў каралеўскай спальні.

быў бы мужам шчодрародым,
быў бы другам вольным,
каб нам бог суліў пагоду,
каб ты быў кароль мой.

КАЛЫХАНКІ ДЛЯ ДЗЕТАК

Для Ягора

Спі, мой верны, мой маленькі рыцар!
Спіць на кухні булачка з карыцай,
Спяць у норках бурыя лісіцы,
Хвосцікі паклаўшы пад шчаку.
Спяць цукеркі ў залатых абгортках,
Спі і ты, пакуль не звялі зоркі,
Спі, зямны мой сыне, спі, Ягорка,
Спі, а я твой сон пасцерагу...

Для Машы

Спі, дачушка, ночка ўжо імгліцца,
спіць жучок салодка на былінцы,
Дзесьці едуць мірыяды прынцаў
Да цябе, і кожны — на кані.
Спіць стракозка, спяць пчала і вусень,
Спяць усе дзяўчынкі Беларусі,
Спі і ты, чароўная Маруся,
Спі, мая харошая, засні...